

БЕЗ КАХАННЯ СЯМ'І НЕ БЫВАЕ
Сямейная газета

ГАДЖЭТЫ Ў ЖЫЦЦІ ДЗІЦЯЦІ
Сямейная газета





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 ЛІСТАПАДА 2021 г. ЧАЦВЕР № 223 (29592)


# ДЗЕСЯЦЬ ДЗЁН, ЯКІЯ ЗМЯНІЛІ СВЕТ



Фота БелТА.

*УЧОРА быў дзясяты дзень, як на беларуска-польскай граніцы пачаўся крызіс з бежанцамі. Прынамсі, так яго называюць і журналісты, і палітолагі. Калі ж гаварыць больш зразумелай простым людзям мовай, дзесяць дзён людзі, якія збеглі з роднай краіны ад вайны або ад нястачы, якія рашыліся на такі адчайны крок дзеля будучыні сваіх дзяцей, замярзаюць на мяжы з Еўрасаюзам. З той самай «зямлёй абяцанай», куды іх калісьці паклікалі, дзе шмат у каго землякі і сваякі. З тымі самымі краінамі, «ваенныя кантынгенты» якіх спрабавалі навесці на радзіме гэтых людзей свой парадак і ўрэшце зруйнавалі тое, што было. На «зямлі абяцанай» іх не чакаюць і не хочуць бачыць увогуле. Прынамсі, на яе польскай частцы. Спачатку пра гэта сведчылі скруткі калючай канцэрціны на мяжы, а пасля — каб ужо ўсім стала зразумела і ніхто нават не сумняваўся — святлошумавыя гранаты, слёзатачывы газ і атрутныя струмені з вадамётаў...*

*Гэтыя дзесяць дзён сапраўды могуць змяніць свет. Нават у тых, хто свята верыў у ідэалы старой добрай Еўропы, дзе самай галоўнай каштоўнасцю некалькі стагоддзяў урачыста аб'яўляўся чалавек і яго правы і свабоды, ілюзіі на гэты конт наўрад ці засталіся. Апошнія з гэтых ілюзій павінны былі змыцца каляровай ледзяной вадой з польскага вадамёта, накіраванай у лістападаўскім холадзе ў бок безабаронных людзей, сярод якіх было шмат жанчын і дзяцей...*

*Не дапамогуць ніякія апраўданні, ніякія фэйкі, ніякія надуманыя прычыны. Застануцца толькі сведчанні і сведкі. Застанецца вялізны металічны вадамёт і ўзброеныя да зубоў ваенныя супраць маленькага хлопчыка, які махае рукой верталёту, не здагадваючыся, што той прыляцеў яго і ягоных бацькоў палохаць. Застануцца гэтыя дзеці на фота, якія глядзяць з-за калючага дроту на ўзброеных вялікіх дзядзькаў. Застануцца гэтыя дзесяць дзён, якія былі ў цывілізаванага свету, каб асэнсаваць і зразумець ступень цывілізаванасці кожнага...*


ISSN 1990 — 763X


## Вынікі размовы Лукашэнкі з Меркель: праблема бежанцаў выносіцца на ўзровень Беларусі і ЕС

Тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з канцлерам Германіі Ангелай Меркель, як і было дамоўлена раней, адбылася ўчора. Аб гэтым БелТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

«Датычылася размова, як вядома, сітуацыі на граніцы Беларусі з краінамі Еўрапейскага саюза. Падрабязна абмеркаваўшы праблему бежанцаў, бакі прыйшлі да пэўнага разумення, як дзейнічаць і рухацца далей у вырашэнні існуючых пытанняў. Дамовіліся Прэзідэнт Беларусі і канцлер Германіі аб тым, што праблема ў цэлым выносіцца на ўзровень Беларусі і ЕС, пры гэтым адпаведныя службовыя асобы, якія будуць вызначаны ад абодвух бакоў, неадкладна ўступяць у перагаворы з мэтай вырашэння існуючых праблем. У гэтым жа кантэксце будзе вырашацца пажаданне бежанцаў трапіць у Германію», — расказалі ў прэс-службе.

Таксама ў размове з канцлерам Германіі да Прэзідэнта Беларусі была даведзена просьба старшыні Еўрапейскай камісіі Уршулі фон дэр Ляен аб абавязковым удзеле ў працэсе міжнародных арганізацый, што займаюцца праблематыкай бежанцаў і мігрантаў, якія ўжо актыўна супрацоўнічаюць з беларускім бокам.

Дамовіліся Аляксандр Лукашэнка і Ангела Меркель і аб кантактах надалей.

З месца падзей

# «ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ ГЭТАЯ СІТУАЦЫЯ СТАЛА ШОКАМ»

## Простыя грамадзяне, грамадскія арганізацыі, улады робяць усё магчымае, каб дапамагчы людзям, якія не па сваёй віне трапілі ў складанае становішча

**Сапраўдныя маштабы гуманітарнай катастрофы можна ацаніць, толькі прыехаўшы ў лагер бежанцаў. Людзі за 10 дзён знаходжання ў паходных умовах выглядаюць знясіленымі, у вачах — неразуменне. Чаму так адбываецца? І колькі яшчэ будзе цягнуцца ўся гэта сітуацыя? Карэспандэнт «Звязды» пабывала ў галоўным цэнтры размяшчэння бежанцаў у Гродзенскай вобласці.**



Фота Маргарыты УШКЕВІЧ.

Мы прыехалі ў лагер раніцай. Ноч на сераду большая частка людзей, якія пакінулі сваю радзіму, правяла ў транспартна-лагістычным цэнтры пагранперахода «Брузгі». Яны выстраіліся ў калону на вуліцы, бо чакаюць падвозу прадуктаў. Побач разгорнуты дзве вялікія палаткі, дзе ўсталяваны сталы. Тут будуць раздаваць ежу. Хутка павінен прыехаць транспарт з гарачым харчаваннем і сухімі пайкамі. Прадстаўнікі Таварыства Чырвонага Крыжа і валанцёры атрымліваюць распараджэнні па арганізацыі харчавання. Трэба сказаць, што людзі ў калоне стаяць спакойна, рэдка хто размаўляе, у асноўным



стаяць моўчкі. Многія, на мой погляд, адзеты не па надвор'і — вопратка даволі лёгкая, а на вуліцы ўсяго тры градусы цяпла.

— Тут знаходзяцца дзеці, жанчыны... Іх літаральна пазалівалі вадой з суседняй тэрыторыі, многія моцна змерзлі. Мы за ноч сабралі цёплыя рэчы, прадукты — рыс, кансервы, прадметы асабістай гігіены, — каб ім дапамагчы, — расказвае **намеснік старшыні БСТ «Дынама» па Гродзенскай вобласці Яўген ДУДКО,** які прывёз гуманітарны груз.

У хуткім часе пачынае працаваць генератар, які абаграве палаткі і забяспечвае ў іх святло. Пад'ехала некалькі бусаў з прадуктамі. Гучыць каманда валанцёрам аб разгрузцы. Бежанцам растлумачана, што напачатку ўсе атрымаюць сухія пайкі ў пакетах, потым пад'едзе гарачая ежа з чаем. Непадалёку знаходзяцца два аўтамабілі хуткай дапамогі, у гэты час якраз праходзіць агляд пацыента. Адна з брыгад дзяжурыла і ноччу, пасля прыбыцця ў лагер была зроблена тэрмаметрыя і аказвалася дапамога на месцы. За апошнія суткі медыцынская дапамога аказана 15 бежанцам, некалькі чалавек шпіталізаваны. Зарэгістраваны звароты з апёкамі і наступствамі прымянення слёзатачывага газу. Як стала вядома, чацвёра дзяцей знаходзяцца на лячэнні ў Гродзенскай абласной дзіцячай бальніцы. У тым ліку маці з двума малымі, аднаму з якіх чатыры месяцы. Усім аказана неабходная медыцынская дапамога, іх жыццю нічога не пагражае.

Тым часам працягваецца раздача сухіх пайкоў. Сабраныя крупы, макароны завязуць у воінскую часць, каб прыгатаваць кашу і прывезці потым у катлах сюды, у лагістычны цэнтр. Цёплыя рэчы, якія сабраны, павязуць у лагер бежанцаў каля польскай граніцы. Дарэчы, у бусах разам з прадуктамі загружаны стосы коўдраў. Яны прызначаны на выпадак непрадбачных і экстранных сітуацый. І гэта зараз вельмі запатрабавана.

Валанцёры, а гэта пераважна прадстаўнікі Таварыства Чырвонага Крыжа, прыехалі з усіх абласцей Беларусі. Яны прайшлі спецыяльную падрыхтоўку для работы ў надзвычайных сітуацыях. Зараз сочаць за тым, каб людзі заходзілі ў палаткі арганізавана, невялікімі партыямі, каб не было таўкатні. У першую чаргу прапускаюць дзяцей і жанчын з дзецьмі.



— Вельмі многа такіх, хто дапамагае ў арганізацыі быту бежанцаў, бо таксама няпроста выбудаваць ланцужок дапамогі. Гэта і раздача гуманітарнага грузу, і кармленне людзей, і забеспячэнне парадку. Мы раздалі людзям, якія знаходзяцца ў лагістычным цэнтры, вялікую колькасць матрацаў, коўдраў, падушак. Раздалі сродкі гігіены, дзецям — памперсы. Зараз раздаём сухія пайкі, ваду, дзецям — ёгурты, малочныя сумесі. Ствараюцца ўмовы для спрыяльнага, наколькі магчыма, знаходжання вялікай колькасці людзей, ёсць дзе памыцца, — пракаментаваў сітуацыю **генеральны сакратар Беларускага Чырвонага Крыжа Дзмітрый ШАЎЦОЎ.**

Ён таксама зазначыў, што ўнутры бокса забяспечана зарадка мабільных прылад. Многія звязаліся са сваімі роднымі і блізкімі, глядзелі навіны са сваіх краін.

Між тым чарга пацыху памяншаецца, людзі выходзяць з палатак з гарачым чаем, хлебам і яйкамі. На абед будзе раздавацца салдацкая каша, якая гатуецца ў воінскай часці.

— З раніцы арганізавана раздача прадуктовых набораў, у абед будзе гарачая каша, наладжаны бесперабойны агляд медыцынскімі работнікамі, — паведаміў **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці Юрый КАРАЕЎ.** — Мы пагледзелі, якая сітуацыя ў лагеры, дзе людзі знаходзяцца на вуліцы і ў палатках, абаграваюцца вогнішчамі. Яны не хочуць адыходзіць ад граніцы. Яны будуць працягваць спробы трапіць па той бок граніцы, каб нагадваць аб сабе. Нашы пагранічнікі разумеюць, што мы не можам дапускаць ніякіх правакацый, эскалацыі. Вядома, пастаянна ўгаворваем, каб жанчын і дзяцей адправілі сюды, у лагістычны цэнтр, але людзі не хочуць разлучацца з сем'ямі. І наогул адыходзіць ад граніцы.

Многія беларусы прапусцілі, што называецца, праз сябе складаны лёс людзей, якія вымушаны пакутаваць на граніцы. **Намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар ПРАНЮК** назваў сітуацыю шокам для многіх беларусаў. Разам з тым паступае мноства званкоў з жаданнем аказаць дапамогу. Гэта і грамадскія аб'яднанні, і мясцовыя ўлады, і проста нераўнадушныя грамадзяне. Дзякуючы гэтаму, становішча бежанцаў значна палепшылася.

— Усе сілы скіраваны на тое, каб забяспечыць нармальныя чалавечыя ўмовы для бежанцаў, — зазначыў Віктар Пранюк. — Мы не кажам пра сур'ёзны бытавы камфорт, але цёплыя рэчы, матрацы, магчымасць знаходзіцца ў цёплым памяшканні, атрымаць медыцынскую дапамогу гэтыя людзі маюць. Варта сказаць, што сярод бежанцаў няма ніякіх правапарушэнняў, эксцэсаў, мы рыхтуем дадатковыя месцы, каб была магчымасць размясціць тут і тых, хто зараз знаходзіцца каля граніцы.

Таксама прадстаўнік абласной вертыкалі паведаміў, што тыя, хто пажадае застацца на тэрыторыі Беларусі, могуць атрымаць тут прытулак і застацца. У сваю чаргу ўлады гатовы забяспечыць мігрантам пражыванне, працу, а дзеці змогуць наведваць навучальныя ўстановы.

У лагер бежанцаў прыехалі прадстаўнікі дэпутацкага корпуса. Імі сабраны сродкі і пералічаны на разлік Чырвонага Крыжа, якім, у сваю чаргу, закуплены неабходныя гігіенічныя наборы і прадукты. Дэпутатамі выказана спадзяванне, што сітуацыя нарэшце вырашыцца і будзе прынята правільнае палітычнае рашэнне. Бо людзі знаходзяцца ў вельмі складаных умовах і перажываюць не выдуманыя, а рэальныя пакуты.

Маштаб гуманітарнай катастрофы становіцца відавочным пры наведванні самога лагістычнага цэнтра. Больш за тысячу людзей размясцілася на падлозе вялікага памяшкання. І хоць усе яны маюць коўдры, матрацы, але ў многіх у вачах нібы застыла пытанне: калі гэта скончыцца? Відавочна, што яны ў роспачы. Малады іракскі бежанец расказаў, што ён у ліку іншых трапіў на граніцы пад вадамётны струмень, усе былі мокрыя і вельмі змерзлі. Але потым, калі іх апынуліся тут, удалося сагрэцца. Зараз у іх усё адзенне прапахла слёзатачывым газам, і гэта вельмі непрыемны пах. Яшчэ ён расказаў, што яму 10 дзён таму ўдалося прайсці на польскі бок, але яго там злавілі польскія пагранічнікі, забралі грошы, мабільны тэлефон і выпхнулі назад у Беларусь.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота БелТА.**

**Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК,** наведаўшы пункт часовага размяшчэння бежанцаў у транспартна-лагістычным цэнтры, расказаў журналістам: «Пасля ўчарашняга абвастрэння на граніцы, калі выкарыстоўваліся вадамёты і таксічныя хімічныя злучэнні, становішча гэтых людзей стала проста катастрафічным. Пры такіх тэмпературах мокрае адзенне — гэта рэальная небяспека для здароўя і жыццё чалавека. Кіраўнік дзяржавы даў даручэнне забяспечыць начлег у нармальных умовах і пры плюсавых тэмпературах», — распавёў Уладзімір Каранік.

Выкананне ўскладнялася тым, што многія людзі адмаўляліся пакідаць граніцу, спадзеючыся на адкрыццё гуманітарнага калідора. Кампраміснае рашэнне ўдалося знайсці. Для прыёму людзей падрыхтавалі плошчы лагістычнага цэнтра ў крокавай даступнасці ад пункта пропуску. Памяшканні былі падрыхтаваны на працягу двух гадзін. Частка бежанцаў перамясцілася сюды. Дзякуючы зладжанай рабоце аператыўна было наладжана не толькі размяшчэнне, але і харчаванне бежанцаў.

«Мы разумелі, што да ночы павінны размясціць людзей, асабліва пацярпелых, у цёплыя ўмовы, каб мінімізаваць рызыку іх здароўю», — адзначыў Уладзімір Каранік.

У другой палове дня на граніцу прыехалі студэнты-валанцёры Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы з веданнем замежных моў.

«Яны будуць дапамагаць у камунікацыі з бежанцамі. Акрамя таго, каля лагістычнага цэнтра працягваюць дзяжурыць тры брыгады «хуткай», якія аказваюць неабходную дапамогу. Цяпер каля цэнтра рыхтуецца да раздачы ежы», — расказаў **старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Віктар ЛІСКОВІЧ.**

Таксама Віктар Лісковіч паведаміў, што ў цэнтры часовага размяшчэння бежанцаў раздадуць 10 тысяч медыцынскіх масак. Зроблена гэта будзе, каб не дапусціць распаўсюджвання інфекцыйных захворванняў, у тым ліку каранавіруса.

# Злачынства супраць чалавецтва і чалавечнасці

## У сувязі з дзеяннямі польскіх сілавікоў на беларуска-польскай граніцы ўзбуджана крымінальная справа

**«Звязда» працягвае сачыць за тым, што адбываецца на беларуска-польскай граніцы. Нагадаем, пазаўчора супраць бежанцаў, якія спрабавалі трапіць на тэрыторыю Польшчы, польскія сілавікі прымянілі спецыяльныя сродкі і боепрыпасы. Сярод пацярпелых ёсць жанчыны і дзеці. Па факце выкарыстання спецсродкаў і боепрыпасаў у адносінах да бяззбройных грамадзян, а таксама прычынення ім цялесных пашкоджанняў на тэрыторыі беларуска-польскай граніцы ў пункце пропуску «Брузгі» Следчы камітэт распачаў праверку. У выніку ўзбуджана крымінальная справа: следчыя кваліфікавалі дзеянні польскіх сілавікоў як злачынства супраць бяспекі чалавецтва.**

### Прымянялася рэчыва, якое выклікае апёкі

— На месцы працуе следча-аператыўная група, задзейнічана пераносная крыміналістычная лабараторыя ведамства, — адзначыў **начальнік аддзела інфармацыі і сувязі з грамадскасцю цэнтральнага апарата Следчага камітэта Сяргей КАБАКОВІЧ.** — За ноч следчымі ва ўзаемадзеянні са спецыялістамі Упраўлення дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Гродзенскай вобласці праведзены агляд, у ходзе якога ў месцах прымянення спецыяльных сродкаў, а менавіта слёзатачывага газу, вадамётаў, святлошумавых гранат польскім бокам, канфіскаваны шматлікія аб'екты, у тым ліку фрагменты металічных і палімерных прадметаў ад боепрыпасаў, травяністай расліннасці і грунту, на якім засталіся сляды рэчываў таксічнага і раздражняльнага дзеяння. Адбываецца допыт пацярпелых і відавочцаў, канфіскаваны і прагледжаны відэазапісы, якія датычацца прымянення польскім бокам спецыяльных сродкаў. Працягваюцца следчыя і працэсуальныя дзеянні з тымі, хто звярнуўся па медыцынскую дапамогу ў сувязі з уздзеяннем таксічных рэчываў.

Акрамя таго, як паведамілі ў Следчым камітэце, па ўсіх канфіскаваных слядах і аб'ектах запланавана правядзенне шэрагу экспертыз. «У Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз для правядзення хімічных даследаванняў паступілі аб'екты, канфіскаваныя 16 лістапада ў ходзе агляду месца здарэння на ўчастку беларуска-польскай граніцы ў раёне пункта пропуску «Брузгі» на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, — паведаміў **начальнік аддзела ўзаемадзеяння са сродкамі масавай інфармацыі цэнтральнага апарату Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Сяргей ЦІТАВЕЦ.** — На даследаванне ўзяты пробы грунту, змывы, узоры расліннасці з напластаваннем афарбаваных рэчываў. У ходзе даследавання ўстаноўлена, што ў іх складзе ўтрымліваюцца злучэнні, якія аказваюць слёзатачывае раздражняльнае дзеянне, а ў пэўнай канцэнтрацыі выклікаюць апёкі слізістай абалонкі і вачэй».

### Сітуацыі — прававая ацэнка

Ацэньваючы сітуацыю на беларуска-польскай граніцы, **генеральны пракурор Андрэй ШВЕД** заявіў, што паказалі выскал тыя, хто летась арганізаваў спробу знішчэння Беларусі. «Здаецца, ужо нават самыя наіўныя людзі бачаць і разумеюць, з кім мы маем справу, — перакананы генпракурор. — Ацэнка сітуацыі адназначна павінна быць прававой. І вінаватыя з польскага боку, якія здзяйсняюць відавочныя супрацьзаконныя дзеянні, павінны панесці адказнасць».

Андрэй Швед дадаў, што неабходныя працэсуальныя дзеянні ўжо прыняты. «Пасля правядзення пэўных экспертных даследаванняў і працэсуальных дзеянняў ведамства дасць больш падрабязную інфармацыю, — патлумачыў ён. — Гэта будуць аб'ектыўныя даныя аб тых формах і метадах траўлі, спробах знішчэння, якія са свайго боку здзяйсняюць польскія сілавікі ў адносінах тых людзей, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі».

### Дапамога працягваецца

А тым часам, як паведамілі ў Дзяржаўным пагранічным камітэце, беларускі бок працягвае размяшчаць бежанцаў у памяшканнях, якія ацяпляюцца. Аднак каля дзвюх тысяч бежанцаў па-ранейшаму знаходзяцца каля беларуска-польскай граніцы. «Мінулую ноч яны правялі ў трох месцах: частка з іх засталася на тэрыторыі, якая прылягае да пункта пропуску, частка — у стыхійным лагеры ў лесе, — расказаў **афіцыйны прадстаўнік Дзяржпагранкамітэта Антон БЫЧКОЎСКІ.** — Каля 1000 чалавек, якія найбольш пацярпелі ад дзеянняў польскіх сілавікоў, а таксама жанчыны і дзеці ўпершыню за апошнія дзевяць сутак пераначавалі ў адносна прымальных умовах — у транспартна-лагістычным цэнтры недалёка ад граніцы. Людзей напярэдадні ўвечары аглядалі медыкі, па дапамогу на працягу ночы звярнуліся чатыры чалавекі. Тым, хто прыняў рашэнне начаваць на вуліцы, неаднаразова прапаноўвалася перайсці ў лагістычны цэнтр».



Фота БелТА.

Традыцыйна беларускі бок забяспечвае бежанцаў гарачым харчаваннем як у лагістычным цэнтры, так і ў лагеры каля граніцы ў палатках, якія ацяпляюцца. Рэгулярна падвозяцца вада, цёплыя рэчы, сродкі гігіены, аказваецца іншая гуманітарная дапамога. Па інфармацыі Дзяржпагранкамітэта, учора раніцай было прынята рашэнне размясціць частку мігрантаў у іншых месцах.

У той жа час, як заявіў **міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ,** з улікам павелічэння патоку замежных грамадзян у Беларусь органамі ўнутраных спраў забяспечваецца ахова грамадскага парадку як у Мінску, так і ў цэлым на тэрыторыі Беларусі. «Якіх-небудзь праблем са знаходжаннем на нашай тэрыторыі замежных грамадзян няма, — запэўніў кіраўнік сілавога ведамства. — Сітуацыя знаходзіцца пад кантролем. У нас дастаткова сіл і сродкаў для забеспячэння аховы грамадскага парадку як у Мінску, так і ў прыгранічных гарадах».

### «З людзей злятала адзенне...»

— Людзі атрымалі хімічныя апёкі вачэй ад раздражняльнага складніка, які быў у вадамётах, — расказаў учора журналістам **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці Юрый КАРАЕЎ,** які наведаў месца здарэння. — Некаторыя журналісты таксама трапілі пад гэты струмень і казалі, што слізістая і вочы пацярпелі ад сумесі, што была ў вадамётах.

**Спецыяльны карэспандэнт тэлеканала АНТ Андрэй АЛЯКСАНДРАЎ** амаль тыдзень знаходзіўся на беларуска-польскай граніцы. Што такое вадамёты і слёзатачывы газ, журналіст зведаў на сабе. «Прымяняючы спецсродкі і боепрыпасы, польскія сілавікі не глядзелі, хто перад імі: жанчыны ці дзеці, яны шчодра лупілі па ўсіх, — расказвае відавочца падзей. — Тое, што вылятае з газавых балончыкаў, раздзірае дыхальныя шляхі, слязяцца вочы, але гэта быў свайго роду «падбадзёрлівы дэзадарант» у параўнанні з тым, што пачалося далей. А далей былі вадамёты. Перад вачыма карціна, як мужчына нёс на сабе жалезныя дзверы, якія ад удару вадамёта паляцелі з такой хуткасцю, быццам яны кардонныя. Струмені вады былі такія, што з людзей злятала верхняе адзенне. Між іншым, лічыцца бесчалавечным прымяняць вадамёты пры тэмпературы ніжэй за восем градусаў цяпла. Найбольшую небяспеку ўяўлялі вадамёты з вадкасцю аранжавага колеру. Было зразумела: з дабаўленнем пэўнага хімічнага рэчыва. Пасля таго як на цябе трапляе струмень гэтай вадкасці, пачынаюць цячы слёзы, сліна, соплі... Немагчыма ні гаварыць, ні дыхаць. А на скуры застаецца апёк, які потым вельмі балюча мачыць вадой: такое адчуванне, што месца апёку гарыць адкрытым агнём. Можна ўявіць, як пасля адчувалі сябе людзі».

Андрэй Аляксандраў прызнаецца: у параўнанні з аператарам тэлеканала яму яшчэ пашанцавала. Аператара АНТ аблілі каляровай вадкасцю з ног да галавы, член здымачнай групы быў перададзены медыкам. Поўнасцю было заліта абсталяванне — камера адразу перастала здымаць.

«Прэса ва ўсіх краінах недатыкальная, нават падчас баявых дзеянняў, — заўважае Андрэй Аляксандраў. — Мы, журналісты, былі абазначаны жоўтымі камізэлькамі: для ўсіх краін зразумела, што працуе прэса. Аднак па факце мы сталі своеасаблівай мішэнню, куды наўмысна цэліліся польскія сілавікі. Святлошумавыя гранаты кідалі не разбіраючыся: яны ўзрываліся каля дзяцей і жанчын. Аднак польскіх сілавікоў гэта не чапляла. Да іх падыходзілі жанчыны са сваімі дзецьмі, агалялі жывоцікі малых, якія ўсе спаласаваныя шрамамі пасля аперацый, аднак іх і гэта не кранала».

...А тым часам, як паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце, спробы гвалтоўнага выцяснення бежанцаў працягваюцца на ўчастку граніцы з Літвой. Відэазапісы, якія ёсць у нашых сілавікоў, сведчаць: пагранічнік сумежнай дзяржавы жорстка збівае мігранта, які ляжыць на зямлі, а затым спускае на яго сабаку, якая кусае чалавека за нагу і пачынае разрываць спальны мяшок...

Калі гэта не зверства, дык што?

**Вераніка КАНЮТА.**

# Замах на жыццё і здароўе

## У Беларусі будуць зафіксаваны сведчанні тых злачынстваў, якія сёння адбываюцца супраць бежанцаў на беларуска-польскай граніцы

**У выніку ўсю інфармацыю збяруць пад вокладкай кнігі. Аб гэтым падчас прэс-канферэнцыі на тэму «Грамадскае расследаванне злачынстваў супраць бежанцаў на граніцы», якая адбылася ў Доме прэсы, заявіў старшыня праўлення Рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае грамадства «Веды» Вадзім ГІГІН.**

— Незафіксаванае і неўсвядомленае злачынства, якому не дадзена ацэнка, на жаль, мае тэндэнцыю да паўтарэння, — падкрэсліў кандыдат гістарычных навук. — Патрэбна разабрацца ў прычынах, якія прывялі да гэтых злачынстваў. Як мінімум без гневу і прадузятасці сабраць сведчанні і факты таго, што адбываецца. Гэта важна яшчэ і таму, што ідзе каласальны паток хлусні і дэзынфармацыі. Мы сутыкаліся з гэтым і раней. А на нашай граніцы, увогуле на граніцы Еўрапейскага саюза гэта адбываецца ўпершыню. Днямі мы бачылі масавую экзекуцыю ў дачыненні да бежанцаў. Гэта быў акт дзяржаўнага тэрору.

Як заўважыў Вадзім Гігін, ужо не раз гучалі заявы аб тым, што неабходна правесці міжнароднае крымінальнае расследаванне фактаў злачынстваў супраць чалавечнасці, якія здзяйсняюцца польскімі і літоўскімі сілавікамі і тымі палітыкамі, якія ім аддаюць загады. «Мы разумеем, што гэта працяглы працэс, хоць парушэнне міжнародных нормаў, у тым ліку Канвенцыі аб правах бежанцаў і Рымскага статута, навідавоку, — перакананы палітолаг. — Мы бачым, як людзей па нацыянальным, расавым, рэлігіёзным прынцыпе выпіхваюць з тэрыторыі Еўрапейскага саюза. Крызіс з літоўска-польскага боку абсалютна рукатворны: дастаткова паглядзець на тое, што паралельна адбываецца на паўднёвых граніцах Еўрапейскага саюза, у Міжземнамор'і. Сёння складана ўявіць такое, што лодку, якая ідзе з Туніса на Сіцылію, палівалі б з вадамётаў, залівалі б людзей слёзатачывым газам і выкідвалі б іх за борт».

**Старшыня Беларускага саюза журналістаў Андрэй КРЫВАШЭЕЎ** звярнуў увагу на неадэкватныя адносіны польскіх улад да ўласных (польскіх) і міжнародных журналістаў месячнай даўнасці, калі два журналісты, якія прадстаўляюць буйны медыяхолдынг Германіі і Францыі, былі затрыманы пры пад'ездзе да зоны надзвычайнай сітуацыі. Гэту зону штучна стварыла Польшча ў прыгранічных раёнах, каб не дапусціць журналістаў і праваахоўнікаў, каб яны не змаглі аб'ектыўна і з месца падзей апісаць становішча бежанцаў, а таксама засведчыць, якія метады прымяняюцца для іх гвалтоўнага выправаджэння з польскай тэрыторыі.

— Пасля гэтага мы ўжо ўбачылі нападзенне на польскіх журналістаў і валанцёраў, якіх у гэтай зоне літаральна адлоўлівалі, праводзілі спецаперацыі па іх затрыманні, — заўважыў кіраўнік журналісцкай арганізацыі. — Увогуле дзікі выпадак, калі вадамёты і газ былі выкарыстаны супраць беларускіх журналістаў. На кадрах, якія мы прагледзелі, відаць, што побач з журналістамі, якія ажыццяўляюць сваю прафесійную дзейнасць, няма агрэсіўна настроеных бежанцаў. І вадамёты з іх хімічнай вадкасцю прыцэльна выкарыстоўваюцца супраць нашых калег-карэспандэнтаў для таго, каб прычыніць шкоду іх здароўю, пашкодзіць камеру, не дапусціць фіксацыі тых злачынстваў, якія адбываліся ў гэты дзень на польска-беларускай граніцы. Гэта можна разглядаць як замах на жыццё і здароўе нашых журналістаў, паколькі прымяненне вадамётаў было ажыццёўлена пры нізкіх тэмпературах. Гэта парушае ўсе прынятыя па так званым гуманітарным вымярэнні, па свабодзе СМІ, свабодзе журналістаў нормы выконваць свае прафесійныя абавязкі, а таксама парушае грамадзянскія правы аўдыторый тых найбуйнейшых рэдакцый, якія ўсе гэтыя дні прысутнічаюць на граніцы. Гэтыя факты павінны ўвайсці ў так званую белую кнігу злачынстваў супраць чалавечнасці.

Вядома, што такая кніга ў найбліжэйшы час будзе выпушчана ў выдавецтве «Беларусь».

**Вераніка КАНЮТА.**

# «ПАДЧАС ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ Ў ПОЛЬСКІМ ЛЕСЕ ПАЛЯВАЛІ НА ЯЎРЭЯЎ, ЦЯПЕР ГЭТА БЕЖАНЦЫ»

**Учора каля Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў у Рэспубліцы Беларусь прайшоў пікет у падтрымку бежанцаў на беларуска-польскай граніцы. Неабыякавыя людзі выступілі супраць бяздзейнасці міжнародных арганізацый у сітуацыі з гуманітарнай катастрофай, зладжанай польскім рэжымам. У прыватнасці, проста абурыла заява намесніка афіцыйнага прадстаўніка генеральнага сакратара ААН Фархана Хака.**

Напярэдадні на брыфінгу ён выказаў занепакоенасць умовамі і абыходжаннем з мігрантамі на граніцы Беларусі і Польшчы. «Мы выступаем за тое, каб з усімі імі абыходзіліся годна», — сказаў афіцыйны прадстаўнік генсека. Аднак, як высветлілася літаральна праз некалькі хвілін, усё гэта аказалася толькі наборам стандартных фраз. На просьбу пракаментаваць паведамленні аб выкарыстанні Польшчай вадамётаў Хак адзначыў, што не мае пацвярджэння дадзенай інфармацыі. «Гэта нягледзячы на тое, што кадры, на якіх было адлюстравана прымяненне палякамі і вадамётаў, і нават святлошумавых гранат, у гэты дзень круціліся ў навінах усіх вядучых тэлеканалаў свету», — заўважыў у сваім артыкуле, які быў апублікаваны РІА «Навіны», вядомы расійскі палітолаг Уладзімір Карнілаў.

## Фабрыка фэйкаў

Падзеі на беларуска-польскай граніцы сталі лакмусавай паперкай для заходняй фабрыкі фэйкаў. Падаваліся кадры з месца падзей часам больш як неаб'ектыўна, заўважыў Уладзімір Карнілаў. Напрыклад, карэспандэнт CNN Мэцью Чэнс, які сам трапіў пад абстрэл польскіх вадзяных гармат і хімічную атаку з выкарыстаннем нейкіх атрутных рэчываў, прымудрыўся ў сваім сюжэце заявіць, што блізкаўсходнія мігранты кідаюць у польскіх памежнікаў не толькі камяні, але і бомбы. А, пагадзіцеся, калі гаворка ідзе пра бомбы, то задзейнічанне вадамётаў падаецца ўжо і не такім залішнім. Той жа факт, што ніхто, акрамя Чэнса, бомбаў у мігрантаў не ўбачыў, гледачоў CNN бянтэжыць не павінен.

Вось маскоўскі ўласны карэспандэнт «Бі-бі-сі» Стыў Розенберг не заўважыў у мігрантаў ні гранат, ні бомбаў, ні снарадаў. Але затое ён, каментуючы неадэкватнае ўжыванне палякамі спецсродкаў, знайшоў гэтаму простае тлумачэнне: вінаваты Мінск. Стоячы на фоне патокаў ледзяной вады, якой палякі аблівалі змёрзлых мігрантаў, Розенберг «даступна» растлумачыў гледачам, што там адбываецца: «Гэта тая карцінка, якую Аляксандр Лукашэнка хоча паказаць свету. Беларусь спрабуе прадставіць Еўропу абыякавай і жорсткай, нават бесчалавечнай».

Ну што ж, калі такая задума была ў беларусаў, то ў іх гэта атрымалася. «Праўда, хочацца спытаць у Чэнса, Розенберга і іх калег: дык гэта беларускія вадамёты, перафарбаваўшыся ў польскія, палівалі няшчасных бежанцаў з польскай тэрыторыі ці ўсё ж Еўропа сёння сапраўды з'яўляецца такой жорсткай і бесчалавечнай, дазваляючы абліваць вадой людзей на нулявой тэмпературы?» — прыкмячае Уладзімір Карнілаў.

Па словах палітолага, вельмі паказальна, як на гэты жорсткі разгон рэагуюць прадстаўнікі беларускай апазіцыі, якія знаходзяцца за мяжой і пастаянна абураюцца, на іх думку, неапраўдана жорсткімі дзеяннямі мінскіх сілавікоў. Так, адно беларускае апазіцыйнае СМІ, якое базіруецца ў Варшаве і ўтрымліваецца на грошы амерыканскіх падаткаплацельшчыкаў, правяло апытанне аб тым, ці апраўдана ўжыванне вадамёта на марозе, і пераважная большасць яго аўдыторыі адназначна ўхвалілі гэтае дзеянне.

## Машыны без сэрца

Дзеля справядлівасці трэба сказаць, працягвае палітолаг, што нават у Польшчы знаходзяцца здаровыя галасы, якія асуджаюць неадэкватныя дзеянні сваіх сілавікоў ва ўмовах не такога ўжо і маштабнага крызісу — ва ўсякім разе, на фоне іншых крызісаў у Еўропе. Напрыклад, відэакадры, на якіх пагранічнікі перакідваюць праз калючы дрот дзяцей, якія плачуць з іх маці, рэзка абурылі вядомую польскую актрысу і спявачку Барбару Курдзей-Шатан. Тая, не выбіраючы выразаў, так ахарактарызавала дзеянні суайчыннікаў: «Гэта машыны без сэрца, без мозгу, без чаго б там ні было. Машыны, якія сляпа выконваюць загады... Забойцы!»

Адразу пасля гэтага адна з самых папулярных польскіх актрыс падвергнулася цкаванню і астракізму. За яе ўзяліся пракуратура і Маніторынгавы цэнтр антыпаланізму (ёсць у гэтай краіне і такія структуры). А міністр юстыцыі Збігнеў Зёбра, адгукаючыся на скандал, заявіў, што рыхтуе папраўкі да Крымінальнага кодэкса краіны з мэтай узмацнення адказнасці «за шпіянаж і дзеянні дэзынтэграцыйнага характару адносна польскай дзяржавы або супраць іміджу нашай краіны».

Вельмі нямногія еўрапейскія СМІ задаюць пытанне, у чым жа сапраўдная прычына чалавечай трагедыі, якая разгортваецца на нашых вачах, хто ж вінаваты ў тым, што тысячы людзей падняліся са сваіх абжытых месцаў і прарываюцца ў зусім чужыя для іх краіны. Адным з такіх нямногіх прыкладаў стала галандская газета NRC, якая змясціла рэпартаж непасрэдна з Іракскага Курдыстана. Выданне пагутарыла з 37-гадовым курдам, які прадаў свой дом, каб набыць білеты для сябе, жонкі, маці і траіх дзяцей, але ў яго ўсё роўна не хапае для гэтага грошай. «Заўважце, на гэты адчайны крок яго штурхнулі не Лукашэнка, не Пуцін, а поўная безвыходнасць, у якой апынуліся «вызвалены» амерыканцамі Ірак і тым больш выкарыстаныя імі і здраджаныя курды. Вось чаго вы не знойдзеце ні ў рэпартажах CNN, ні тым больш у польскіх СМІ», — піша Уладзімір Карнілаў.




Фота БелТА.

## Падрыхтоўка да суднага дня

Еўрасаюз замест таго, каб аказаць гуманітарную дапамогу бежанцам, называе гэтых галодных людзей, якія замярзаюць на граніцы Польшчы, «гібрыднай зброяй», піша выданне The National.

Бежанцы, каму ўдалося перайсці граніцу, зараз рызыкуюць загінуць у польскіх лясах, дзе на іх палююць як на звяроў. «Падчас Другой сусветнай вайны ў польскім лесе палявалі на яўрэяў, цяпер гэта бежанцы», — сказала The National Ліда Вертс, удзельніца дыпламатычнай місіі еўрапейскага Кангрэса курдскіх дэмакратычных таварыстваў (KCDK-E). Паводле яе слоў, большасць людзей, якія спрабуюць перасекчы граніцу з Беларусі ў Еўрапейскі саюз, з'яўляюцца курдамі.

Калі дэлегацыя KCDK-E прыбыла ў Польшчу, яна выявіла, што сітуацыя ў краіне настолькі напружаная, што «нібы ідзе падрыхтоўка да суднага дня». Паліцыя і вайскоўцы былі паўсюль, правяраючы дакументы людзей. Ліда Вертс галандка, але яна магла назіраць непрыязнасць на вуліцах да сваіх курдскіх калег.

І ўсё ж людзі па-ранейшаму прыходзяць паспрабаваць шчасця ў гэтай вялізнай авантуры, перакананыя, што яны нейкім чынам пераадолеюць цяжкасці граніцы і апынуцца ў такім месцы, дзе змогуць спадзявацца на лепшую будучыню для сябе і сваіх дзяцей. «Краіны, якія кінуліся на абарону Польшчы, павінны спытаць сябе, чаму так шмат людзей эмігрыруе — як з раёнаў, якія сталі непрыдатнымі для жыцця ў выніку імперыялістычных войн, так і з Іракскага Курдыстана з глыбока карумпаваным урадам», — адзначае The National.

## Вяртанне ў мінулае

Тым часам Папа Рымскі Францыск назваў будаўніцтва сцен на граніцах і перамяшчэнне мігрантаў у небяспечныя месцы прыкметамі вяртання ў мінулае. Аб гэтым ён заявіў у прывітальным пасланні з нагоды 40-годдзя дзейнасці Езуіцкай службы па справах бежанцаў у Італіі, паведамляе тэлеканал Rai News. Як адзначае тэлеканал, у пасланні Папы Рымскага ёсць дакладная спасылка на падзеі ў Польшчы.

Пантыфік звярнуў увагу, што колькасць людзей, вымушаных бегчы, увесь час павялічваецца. Многія з гэтых людзей жылі ва ўмовах рабства ці ў краінах, дзе ідзе вайна. У іх часта няма іншага выйсця, акрамя як «адправіцца ў бяспечнае месца, дзе можна «ажыццявіць мары і спадзяванні, знайсці прымяненне сваім талентам і навыкам». Пантыфік назваў бежанцаў «тварам надзеі», у тым ліку дзякуючы «мужнасці ў пераадоленні цяжкасцяў, якія многім могуць здацца непераадольнымі». Яны дапамагаюць нам не паўтараць памылак мінулага, змяніць сучаснасць і будаваць мірную будучыню, падкрэсліў Францыск.

## Шляхі вырашэння

Еўрасаюз павінен размаўляць з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам для вырашэння міграцыйнага крызісу. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Літвы Гітанас Наўседа, паведаміла ТАСС. Наўседа заклікаў абмяркоўваць з Аляксандрам Лукашэнкам выкліканыя крызісам гуманітарныя праблемы, а таксама патрабаваць ад ведамстваў ЕС змен у міграцыйнай палітыцы і ўдзелу ў будаўніцтве фізічнага бар'ера на граніцы.

А Польшча разглядае прапановы саюзнікаў па НАТА аб дапамозе ў вырашэнні міграцыйнага крызісу на польска-беларускай граніцы. Пра гэта заявіў на брыфінгу Якуб Кумох, прадстаўнік канцылярыі польскага прэзідэнта Анджэя Дуды, які адказвае за міжнародную праблематыку, гаворачы на пытанне аб магчымай падтрымкі саюзнікаў.

Беларусь нацэлена на сумесны пошук шляхоў вырашэння існуючых праблем, уключаючы больш хуткае ўрэгуляванне міграцыйнага крызісу. Аб гэтым падчас чарговай тэлефоннай размовы з намеснікам старшыні Еўрапейскай камісіі, высокім прадстаўніком Еўрапейскага саюза па замежных справах і палітыцы бяспекі Жазэпам Барэлем заявіў міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь Уладзімір Макей, паведамілі ў прэс-службе МЗС Беларусі.

**Пётр ДУНЬКО.**

**• У тэму**

### ПРЫНЯЦЬ НЕАДКЛАДНЫЯ МЕРЫ

Дзеянні Польшчы на граніцы вядуць да дэстабілізацыі абстаноўкі і пагражаюць жыццю людзей, заявіў старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Андрэй Савіных. Ён агучыў журналістам афіцыйную заяву пастаяннай камісіі ў сувязі з міграцыйным крызісам, які абвастраецца, перадае БелТА. «Пастаянная камісія па міжнародных справах выказвае сур'ёзную заклапочанасць у сувязі з абвастрэннем сітуацыі на граніцы Рэспублікі Беларусь з Еўрапейскім саюзам, выкліканым міграцыйным крызісам. Тысячы мігрантаў, якія імкнуцца атрымаць прытулак у краінах Еўрасаюза, жорстка блакіруюцца польскімі сілавымі ведамствамі ў стыхійным лагеры. Мы абураныя дзеяннямі польскага боку, які выкарыстоўвае вадамёты і слёзатачывы газ супраць безабаронных людзей, якія імкнуцца да мірнага жыцця», — сказаў Андрэй Савіных. У мэтах недапушчэння далейшай эскалацыі напружанасці і выратавання чалавечых жыццяў беларускія дэпутаты заклікаюць міжнародныя арганізацыі і найперш органы самога Еўрапейскага саюза прыняць неадкладныя меры для вырашэння міграцыйнага крызісу. «Мы патрабуем прыняцця крокаў па адкрыцці калідора для бежанцаў як дзейснага інструмента ўрэгулявання ўзніклай праблемы», — дадаў парламентарый.

# «Беларусы — добры народ...»

**Наша краіна робіць усё магчымае,
каб аблегчыць долю бежанцаў.
І гэта не застаецца незаўважаным людзьмі,
якія не па чутках ведаюць,
што такое ўцякаць ад вайны і галечы.**

**Сафі Сайфурахман Махамеджан, старшыня Міжнароднай дабрачыннай грамадскай арганізацыі афганскіх бежанцаў «Афганская абшчына»,** адзначыў у сувязі з гэтым у гутарцы з журналістамі:

— Афганістан, як ніхто іншы, адчуў на сабе наступствы ўмяшання краін Захаду і сутыкнуўся з міграцыйным крызісам. Вайна ў Афганістане — чужая вайна, якую там развязалі іншыя краіны. Мільёны афганцаў вымушана жывуць у іншых краінах. На іх радзіме ўсё разбурана, у іх нічога не засталося там для мірнага жыцця, — лічыць Сафі Сайфурахман Махамеджан. — Цяпер шмат бежанцаў знаходзіцца на беларуска-польскай граніцы. Гэтыя людзі хочуць жыць, імкнуцца, каб іх дзеці засталіся ў жывых. Яны прыехалі ў Беларусь, каб адсюль з'ехаць у заходнія краіны і зладзіць сабе і сваім родным добрую будучыню.

Як зазначыў старшыня арганізацыі, прадстаўнікі «Афганскай абшчыны» сабралі гуманітарную дапамогу і перадалі бежанцам на граніцу. «Вельмі балюча назіраць за лёсам бежанцаў, сярод якіх дзеці, старыя, жанчыны, моладзь, якія ад голаду і холаду могуць загінуць. Для нас вельмі каштоўна, што беларусы — добры народ, што ваша дзяржава дапамагае ім, кожны ўносіць пасільны ўклад, — падкрэсліў ён. — Ад імя нашага шматпакутнага народа, усіх афганцаў хачу папрасіць кіраўніцтва Еўрасаюза неадкладна спыніць гэты бардак і прыняць да сябе бежанцаў. Калі яшчэ больш пахаладае, яны могуць загінуць проста на месцы. Нельга дапускаць сітуацыю, каб жанчыны, мужчыны і дзеці гінулі».

**Эль-Вадыя Ібрагім Мустафа, старшыня Міжнароднага грамадскага аб'яднання «Палесцінская абшчына»,** таксама звярнуў увагу на важнасць аказання падтрымкі бежанцам. «Сёння мы збіраемся з нашымі землякамі, каб сабраць рэчы, у якіх маюць патрэбу бежанцы. Хтосьці ім паабяцаў, што Еўропа — рай. Але насамрэч гэта аказваецца не так, і відаць, што адбываецца на граніцы: бежанцаў ніхто не чакае. Таму мы павінны сустрэцца з імі, каб растлумачыць рэальную сітуацыю, растлумачыць, што іх чакае...»

# Усе адценні карычневага

## Чаму неанацызм прапісаўся ва Украіне?




**Злучаныя Штаты і Украіна сталі адзінымі краінамі, якія выступілі супраць прыняцця Генеральнай Асамблеяй ААН расійскай рэзалюцыі аб барацьбе з геразацыяй нацызму і неанацызмам. Пра гэта сведчаць вынікі галасавання, паведаміла ТАСС. У падтрымку рэзалюцыі выступіла 121 краіна, устрымаліся 53. Сярод тых, хто ўстрымаўся, — шэраг еўрапейскіх краін, у тым ліку Германія, Францыя, Бельгія, а таксама ўсе балтыйскія — Эстонія, Літва, Латвія. Рэзалюцыя ў выніку была прынята. Як адзначыў упаўнаважаны МЗС РФ па пытаннях правоў чалавека, дэмакратыі і вяршэнства права, намеснік дырэктара Дэпартамента па гуманітарным супрацоўніцтве і правах чалавека Рыгор Лук'янцаў, у дакуменце падкрэсліваецца недапушчальнасць «геразацыі тых, хто мае дачыненне да злачынстваў нацызму, у тым ліку абяленне былых членаў арганізацыі СС, уключаючы падраздзяленні «Вафен-СС», прызнаныя злачыннымі Нюрнбергскім трыбуналам». Афіцыйны Кіеў дакладна акрэсліў сваю пазіцыю ў гэтым пытанні: прадстаўнік краіны абвінаваціў аўтараў рэзалюцыі ва «ўмяшанні ва ўнутраныя справы дзяржаў». Пагадзіцеся, у кантэксце рэзалюцыі, вынесенай на абмеркаванне Генасамблеі, выказванне мае канкрэтны сэнс. Чаму неанацызм трывала прапісаўся ва Украіне?**

### Таран Кіева

Тыя, хто назірае за сітуацыяй ва Украіне, усё часцей гавораць аб тым, што ініцыятыву там павольна, але дакладна перахапляюць ва ўлад нацыяналісты і нават ультранацыяналісты, адзначыла gazeta.ru. Сведчаннем таму не толькі перайменаванне вуліц, праспектаў і плошчаў у гонар фігур украінскага нацыяналістычнага руху першай паловы мінулага стагоддзя, але і тое, што адбывалася ў краіне 9 мая. Цяпер ва Украіне праварадыкальны групоўкі, якія ў свой час былі ўдарнымі атрадамі Майдана, сталі рэальнай палітычнай сілай, лічыць намеснік дырэктара Інстытута стратэгічных даследаванняў і прагнозаў РУДН, член Грамадскай палаты РФ Мікіта Данюк, паведаміла gazeta.ru.

«Сілай, якая ў адрозненне ад паліцыі рэальна насаджвае сваё меркаванне нешмат шасці большасці ўкраінскага народа. Гэта галоўны сілавы таран Кіева, гэтыя людзі тэрарызуюць грамадзян, запалохваюць суддзяў, дэпутатаў, адціскаюць маёмасць, вытворчасць, захопліваюць цэрквы. Ну і не грэбуюць камерцыйнымі разборкамі за пэўную плату, — канстатаваў Мікіта Данюк. — Прычым, як мы бачым, галасы выбарнычкаў гэтым неанацыстам не патрэбныя, таму што яны па вызначэнні адмаўляюць дэмакратычны працэс, і тых, хто маркуе, што яны робяць няправільна і наогул з'яўляюцца паразітамі для ўкраінскай дзяржавы, лічаць саўкамі. Для іх галоўнае — пачуццё поўнай беспакаранасці ад дзяржавы. І пры гэтым, як мы ведаем, яны маюць заступніцтва ад афіцыйных сілавых структур».

### Ультраправыя бяруць верх

Пакаранні, якія атрымліваюць неанацысты ад запалоханай імі ж судовай улады, па сутнасці, даюць ім зялёнае святло на ўчыненне ўсё новых злачынстваў, заўважыў Мікіта Данюк. «Адзін з забойцаў пісьменніка Алеся Бузіны — сябра неанацысцкай арганізацыі — увогуле быў абраны ў склад грамадскай рады пры нацыянальным антыкарупцыйным бюро. Нейкія нацысты, якія ў рамках бытавога канфлікту зарэзалі чалавека ў вулічнай сварцы, таксама не былі пакараныя. Насамрэч шмат яскравых сведчанняў таго, што неанацысты рэальна бяруць верх», — канстатаваў эксперт.

«Штогод праходзіць факельнае шэсце па аналогіі з факельным шэсцем у нацысцкай Германіі. Ідзе наступ і на правы рускамоўных грамадзян, бо, як толькі здарыўся Майдан, адразу ж быў адменены закон аб асновах дзяржаўнай палітыкі. Па сутнасці, цяперашняя ўлада робіць усё, каб рускамоўная большасць не адчувала сябе дома, знаходзячыся на ўкраінскай зямлі», — падкрэсліў ён.

«Самае цікавае, што Парашэнка навязваў гэтую палітыку, але калі прыйшоў Зяленскі, які выступаў за іншыя рэчы, ён гэтую палітыку ўспрыняў, пашырыў, і пры цяперашнім прэзідэнце рэальная сітуацыя стала яшчэ больш складанай», — лічыць Мікіта Данюк.

Яшчэ далей ідзе ў сваёй ацэнцы сутнасці таго, што адбываецца ва Украіне, галоўны рэдактар часопіса «Нацыянальная абарона» Ігар Каротчанка, адзначыла gazeta.ru. «Неанацызм становіцца часткай палітычнага жыцця Украіны яшчэ з часоў Майдана, — канстатуе ён. — Сёння нацысцкія ідэі адкрыта прапагандуюцца і ўслаўляюцца. Апяваюцца ў тым ліку тыя людзі, якія ў часы Другой сусветнай вайны служылі на баку гітлераўскай Германіі. А сёння мы бачым, што неанацысты дамінуюць і ідэалагічна, і практычна ва ўсіх сферах грамадскага жыцця... Сённяшняя Украіна мае ярка выяўленае карычневае адценне, і не заўважаць гэтага не можа толькі прадузяты чалавек».



### На дзяржаўным узроўні

Украінскі ўрад, прычым як рэгіянальнага, так і дзяржаўнага маштабаў, адмаўляецца прымаць рашэнні Нюрнбергскага трыбунала і замест гэтага пачынае публічна падтрымліваць членаў ваенных фарміраванняў нацысцкіх рухаў. І вось ужо мерапрыемствы ў гонар украінскіх эсэсаўцаў сталі праходзіць ва ўмовах царкоўнай і дзяржаўнай абстаноўкі, паведаміла польскае выданне Myslpolska. Праявы падтрымкі нацысцкіх ідэй на тэрыторыі Украіны, як адзначаецца ў артыкуле, найбольш шматлікія ў супастаўленні з іншымі краінамі.

На дзейнасць неанацысцкіх арганізацый звярнула ўвагу група французскіх дэлегатаў. Пасля свайго візіту ў Кіеў яна звярнулася да міністра замежных спраў Францыі з просьбай адрэагаваць на існуючую сітуацыю з распаўсюджваннем нацысцкай ідэалогіі. У сваю чаргу прэзідэнт Украіны Уладзімір Зяленскі і разам з ім урад краіны, падкрэсліла Myslpolska, не рабілі спроб супрацьстаяння праслаўленню нацысцкіх утварэнняў. Наадварот, Кіеў усё больш і больш пацвярджау сумненні па частцы «працвераження» ў сваіх пазіцыях: напрыклад, раней стала вядома аб прысутнасці вайскоўцаў прэзідэнцкага палка на пахаванні ўдзельніка дывізіі СС «Галічына», хоць да гэтага тагачасны спікер Вярхоўнай рады Дзмітрый Разумкоў паказваў на недапушчальнасць распаўсюджвання нацызму на тэрыторыі Украіны, дадаўшы, што ў краіне няма ніводнай сям'і, якая б не страціла блізкіх у часы Вялікай Айчыннай вайны.

Геразацыя нацызму, распаўсюджванне неанацызму і іншых відаў практыкі, якія садзейнічаюць эскалацыі сучасных форм расізму, расавай дыскрымінацыі, ксенафобіі і звязанай з імі нецярпімасці, прымаюць устойлівы характар. Пра гэта гаворыцца ў дакладзе, які быў змешчаны на сайце МЗС Расіі. Як вынікае з дакумента, ва Украіне «зафіксаваны ўвесь спектр праяў прынятай на дзяржаўным узроўні ліній на геразацыю нацызму, нацысцкіх памагатых часоў Другой сусветнай вайны, прызнаных злачыннымі рашэннем Нюрнбергскага трыбунала».

Як адзначыў у выступленні перад галасаваннем па рэзалюцыі аб барацьбе з геразацыяй нацызму і неанацызмам упаўнаважаны МЗС РФ па пытаннях правоў чалавека, дэмакратыі і вяршэнства права, намеснік дырэктара Дэпартамента па гуманітарным супрацоўніцтве і правах чалавека Рыгор Лук'янцаў, «не можа не выклікаць найглыбейшай трывогі і факт, што тых, хто ваяваў супраць антыгітлераўскай кааліцыі або супрацоўнічаў з нацыстамі, усё часцей спрабуюць узвесці ў ранг нацыянальных герояў і герояў нацыянальна-вызваленчых рухаў». «І гэта адбываецца ў краінах, якія перажылі нацысцкую акупацыю ў гады Другой сусветнай вайны, чые геройчныя народы ўнеслі важкі ўклад у разгром нацызму», — заўважыў дыпламат.

### «Жывём у пекле»

Украінская партыя «Апазіцыйная платформа — За жыццё» (АПЗЖ) назвала злачынствам рашэнне Кіева не падтрымліваць расійскі праект рэзалюцыі Генеральнай Асамблеі ААН па барацьбе з геразацыяй нацызму, паведаміла прэс-служба партыі. «Адмова асудзіць нацызм — чарговае злачынства ўкраінскай улады супраць пакаленняў украінцаў. Толькі дзве краіны ў свеце — Украіна і Злучаныя Штаты Амерыкі — выступілі супраць рэзалюцыі Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый аб барацьбе з геразацыяй нацызму і неанацызмам», — адзначаецца ў заяве АПЗЖ.

Таксама ў партыі назвалі рашэнне Кіева злачынствам супраць уласнага народа. «Апазіцыйная платформа — За жыццё» ўспрымае сістэмную палітыку ўлады, якая выступае супраць асуджэння геразацыі нацызму і неанацызму, як злачынства супраць свайго народа, публічны акт адрачэння ад подзвігаў мільёнаў украінскіх салдат і мірных грамадзян — народа, які пацярпеў адны з самых вялікіх страт у гады Вялікай Айчыннай вайны. Гэта злачынства нараўне з разрабаваннем Украіны, перадачай яе пад знешняе кіраванне, знішчэннем медыцыны, навукі, прамысловага патэнцыялу, а таксама гістарычнай памяці народа», — падсумавалі ў партыі.

Раней дэпутат Вярхоўнай рады ад партыі «Апазіцыйная платформа — За жыццё» Ілья Ківа абвінаваціў прэзідэнта краіны Уладзіміра Зяленскага ў падтрымцы нацыяналістычных настрояў у краіне. «Украіна сёння — гэта калыска фашызму ў Еўропе!» — заявіў Ківа ў сваім тэлеграм-канале. Сярод апошніх навін, што называецца ў тэму, — прызначэнне саветнікам галоўнакамандуючага Узброенымі сіламі Украіны экс-лідара руху «Правы сектар» Дзмітрыя Яраша.

«Мы закінуты не проста ў сярэднявечча — мы жывём ужо ў пекле ў поўным сэнсе слова», — заўважыла ў эфіры YouTube-канала PolitWera заслужаны дзеяч мастацтваў Украіны актрыса Любоў Цітарэнка. Яна адзначыла, што краіна скочваецца ў няспынны гвалт і прымітывізм. «Ва Украіне — спальванне кніг і росквіт неанацызму, — з горыччу сказала Любоў Цітарэнка. — Цяпер экстрэмісты дзейнічаюць фактычна з ухвалы афіцыйнай улады».

**Пётр ДУНЬКО.**

### Даслоўна

#### «Нам нельга паўтарыць памылкі Украіны»

«Адраджэнне нацызму ва Украіне стала самай вялікай трагедыяй для ўсяго славянскага свету. Пры патуранні ўлад і маўклівай згодзе, а таксама фінансавай падтрымцы калектыўнага Захаду краіна аказалася ў стане грамадзянскай вайны і стала дэстабілізуючым фактарам у сістэме рэгіянальнай бяспекі, — заўважыў БелТА **загадчык аддзела сацыялогіі дзяржаўнага кіравання Інстытута сацыялогіі НАН кандыдат філасофскіх навук Мікалай ШЧОКІН.** — У сувязі з гэтым лічу, што прынятая пастанова Саўміна нумар 575 «Аб мерах супраць экстрэмізму і рэабілітацыі нацызму» з'яўляецца фундаментальным фактарам у процістаянні гэтаму злу. Суверэннасць і незалежнасць Беларусі — найвышэйшыя і галоўны здабытак беларусаў. Менавіта таму меры па спыненні экстрэмізму і геразацыі нацызму жыццёва важныя. «Заходняя дэмакратыя» Украіны павінна стаць добрым урокам для Беларусі. Кожны з нас павінен несці адказнасць перад краінай і лёсам будучых пакаленняў».

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Талібы папрасілі ЗША разблакіраваць грошы Афганістана

Міністэрства замежных спраў руху «Талібан» звярнулася з адкрытым лістом да Кангрэса ЗША, у якім папрасіла разблакіраваць сродкі Афганістана.

«Мы занепакоеныя тым, што ў выпадку захавання цяперашняй сітуацыі афганскі ўрад і народ сутыкнуцца з праблемамі, якія стануць прычынай масавай міграцыі ў рэгіёне і ў свеце, што, такім чынам, створыць дадатковыя гуманітарныя і эканамічныя праблемы», — гаворыцца ў лісце, тэкст якога апублікаваны на падкантрольных талібам інтэрнэт-рэсурсах.

Талібы нагадваюць, што з абвяшчэннем новага ўрада ў Афганістане ЗША ўвялі санкцыі ў дачыненні да актываў Цэнтрабанка Афганістана, што, на іх думку, «супярэчыць Дахінскай дамове». «Пасля падпісання Дахінскага пагаднення ў лютым 2020 года мы больш не знаходзімся ў прамым канфлікце адзін з адным і не з'яўляемся ваеннай апазіцыяй. Якая логіка можа стаяць за замарожваннем нашых актываў?» — адзначаецца ў дакуменце. Цяпер, як сцвярджаюць талібы, Афганістан «надзелены адзіным, адказным і не карумпаваным урадам, і замарожванне яго актываў нелагічна».

### Меркель абвінавацілі ў стварэнні «ценявой канцылярыі»



У Германіі абвінавацілі выконваючую абавязкі канцлера краіны Ангелу Меркель у намеры стварыць «ценявое ведамства» пасля сыходу з пасады. Пра гэта паведамляе выданне Spiegel.

Па даных Міністэрства фінансаў ФРГ, у бюро Меркель пасля таго, як яна пакіне цяперашнюю пасаду, будуць працаваць дзевяць чалавек. Адзначаецца, што работа офісаў былых канцлераў і прэзідэнтаў часта падвяргаецца крытыцы ў ФРГ. Так, у 2019 годзе штат такіх ведамстваў быў абмежаваны пяццю пазіцыямі, якія аплачваюцца з бюджэту.

Прадстаўнік партыі «Левыя» Гезіне Лецш заявіла, што багатае абсталяванне офіса Меркель робіць уражанне, нібы яна хоча стварыць «ценявую канцылярыю». Паводле яе слоў, з-за гэтай сітуацыі ўзнікаюць падазрэнні, што міністр фінансаў Германіі Олаф Шольц «па вушы ў даўгах» перад Меркель.

Раней генеральны сакратар сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі (СДПГ) Ларс Клінгбайль назваў тэрміны абрання новага канцлера краіны. Паводле яго слоў, СДПГ, «Зялёныя» і свабодныя дэмакраты разлічваюць, што гэта адбудзецца да 12 снежня.

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец), в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Н. М. Колеснёва, извещает о проведении 13 декабря 2021 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 90 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 311/С-181**, общей площадью **58,5 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **КПП. Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4. **Изолированное помещение с инв. № 311/D-8627**, общей площадью **1 226,7 кв. м,** назначение – административное помещение, наименование – **помещение здания конторы. Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4-1. **Изолированное помещение с инв. № 311/D-9721**, общей площадью **2 087,5 кв. м,** назначение – помещение транспортного назначения, наименование – **производственный корпус № 2254. Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4-2. **Капитальное строение с инв. № 311/С-30617**, общей площадью **0,0 кв. м,** назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – **хозфекальная канализация. Капитальное строение с инв. № 311/С-30619**, общей площадью **0,0 кв. м,** назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – **водопровод. Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4-2. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321250100003002034** общей площадью **0,8513 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4. | **31 518,80** | 1 575,94 | 3 151,88 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука,12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснёв Николай Михайлович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой»)**: р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 18 ноября 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 9 декабря 2021 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **5 (пять) дней** до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, **увеличенной на 5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. От 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 12.02.2021 № 27 (29396). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by в разделе «Аукционы» или на www.gomeloblreklama.by, www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.**

## Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки». г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Тел. (017) 280-36-37 |
| **Продавец** | ОАО «Строймаш», ул. Рыбалко, д. 26, 220033, г. Минск |
| **Предмет аукциона: имущество, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Рыбалко, д. 17** | |
| **Лот № 1** | Иное имущество в количестве 5 единиц (инвентарные номера по бух. учету 00001738, 00004139, 00000781, 00004063, 00001739) |
| **Начальная цена с учетом НДС 20 %: 63 480,00 бел. руб. Сумма шага аукциона: 3 174,00 бел. руб.** | |
| **Лот № 2** | Иное имущество в количестве 12 единиц (инвентарные номера по бух. учету 00004141, 00000773, 00000772, 00000774, 00000779, 00000776, 00000777, 00001069, 00001738, 00003555, PK260071, 00004054) |
| **Начальная цена с учетом НДС 20 %: 554 520,00 бел. руб. Сумма шага аукциона: 27 726,00 бел. руб.** | |
| **Лот № 3** | Установки кокильные в количестве 16 единиц (инвентарные номера по бух. учету 00001550, 00001537, 00001787, 00001788, 00001789, 00001790, 00001549, 00001899, 00001898, 00001650, 00001598, 00001613, 00003661, 00003807, 00003808, 00003809) |
| **Начальная цена с учетом НДС 20 %: 21 996,00 бел. руб. Сумма шага аукциона: 1 099,80 бел. руб.** | |
| **Порядок ознакомления с предметом аукциона:** осуществляется в рабочие дни с 09.00 по 16.00 – Николай Маркович, 8044-505-16-54 | |
| Лица, желающие принять участие в торгах, обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390 | |

| | |
|---|---|
| **Порядок оформления участия в торгах, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяется ст.ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»** | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | |
| Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов | |
| Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору в размере 5 % от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.cpo.by | |
| **Дата, время, место проведения аукциона: 16.12.2021 в 14.00,** г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки». Для участия в аукционе необходимо перечислить организатору торгов задаток, а также подать заявление с приложением всех необходимых документов в срок с 09.00 15.11.2021 до 17.00 14.12.2021 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Контактные телефоны: +375 29 317-95-42; +375 44 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** | |

## Извещение о проведении повторных электронных торгов в форме открытого аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. |
| **Продавец** | УТП «БелшинаТранс», Могилевская область, г. Бобруйск, Минское шоссе |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**
**Месторасположение: г. Бобруйск, ул. Минское шоссе (территория ОАО «Белшина»)**

| № лота | Наименование | Инвентарный номер | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб., (снижена на 20 %) |
|---|---|---|---|
| 1 | **Автобус-вагон** MAZ 256170, гос. знак АВ 4216-6, 2011 г. в. | 06000500003 | **66 738,47** |
| 2 | **Специальный седан ГАЗ 31105,** гос. знак 0007 АК-6, 2005 г. в. | 06050000045 | **3 128,69** |

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов **www.cpo.by.** Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в ОАО «Белинвестбанк» (г. Минску), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 15 (пятнадцать) рабочих дней после проведения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его **права и обязанности, штрафные санкции** прописаны в соглашении о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 3 % от цены продажи по лоту № 1 и 5 % от цены продажи по лоту № 2 в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Извещение о проведении предыдущих электронных торгов было опубликовано в газете «Звязда» от 15.09.2021 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | Начало торгов – в **11.00 08.12.2021**. Окончание торгов – в **13.00 08.12.2021**. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 07.12.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |
| **Контактные телефоны** | +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06 E-mail: auction@cpo.by |

## РУП «Торговый дом «Восточный»
### извещает о проведении 23.12.2021 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства

**Лот № 1.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816285 общей площадью 14,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-124. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 28). **Начальная цена продажи – 13 536,00 бел. рублей, задаток – 1 353,60 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 2.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816286 общей площадью 14,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-125. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 29). **Начальная цена продажи – 13 608,00 бел. рублей, задаток – 1 360,80 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 3.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816287 общей площадью 13,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-129. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 33). **Начальная цена продажи – 13 176,00 бел. рублей, задаток – 1 317,60 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 4.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816288 общей площадью 13,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул.Лукьяновича, 2В-130. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 34). **Начальная цена продажи – 13 176,00 бел. рублей, задаток – 1 317,60 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 5.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816289 общей площадью 15,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-134. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 38). **Начальная цена продажи – 14 184,00 бел. рублей, задаток – 1 418,40 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 6.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816293 общей площадью 13,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-145. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 2). **Начальная цена продажи – 13 248,00 бел. рублей, задаток – 1 324,80 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 7.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816294 общей площадью 14,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-151. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 8). **Начальная цена продажи – 13 536,00 бел. рублей, задаток – 1 353,60 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 8.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816292 общей площадью 14,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-141. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 20). **Начальная цена продажи – 13 464,00 бел. рублей, задаток – 1 346,40 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 9.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816291 общей площадью 14,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-140. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 21). **Начальная цена продажи – 13 608,00 бел. рублей, задаток – 1 360,80 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 10.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816290 общей площадью 15,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-136. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 25). **Начальная цена продажи – 14 256,00 бел. рублей, задаток – 1 425,60 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 11.** Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-26923 общей площадью 1 034,9 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, пер. Новый 4-й, 7А/1. Назначение: здание специализированное иного назначения; наименование: здание специализированное иного назначения. Составные части и принадлежности: вспомогательный корпус, столярный цех. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624650100001006412 площадью 2,5606 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 162 432,00 бел. рублей, задаток – 16 243,20 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 12.** Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-27702 площадью 597,5 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, пер. Новый 4-й. Назначение: здание специализированное складов; наименование: здание специализированное складов. Составные части и принадлежности: материально-технический склад. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 642500000001000080 площадью 1,3627 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 76 377,60 бел. рубля, задаток – 7 637,76 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 13.** Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-68376 площадью 149,7 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, пер. Новый 4-й, 5А. Назначение: здание неустановленного назначения; наименование: бытовые помещения. Составные части и принадлежности: бытовые помещения. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 642500000001000080 площадью 1,3627 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 58 060,80 бел. рублей, задаток – 5 806,08 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 14.** Капитальное строение с инвентарным номером 252/С-65 общей площадью 1 335,1 кв. м., расположенное по адресу: Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Промышленная, 11А. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта; наименование: гараж-стоянка с бытовыми помещениями. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 241800000009002183 площадью 2,3915 га (право постоянного пользования). В отношении части капитального строения имеются действующие договоры аренды. **Начальная цена продажи – 124 578,00 бел. рублей, задаток – 12 457,80 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 15.** Изолированное помещение с инвентарным номером 614/D-17867 общей площадью 40,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, Озерицко-Слободской с/с, аг. Слобода, ул. Машерова, д. 3, кв. 71. Назначение: квартира; наименование: квартира (имеется самовольная перепланировка, незарегистрированная в установленном порядке; имеются зарегистрированные граждане). **Начальная цена продажи – 81 000,00 бел. рублей, задаток – 8 100,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 16.** Капитальное строение с инвентарным номером 320/С-22283 общей площадью 1051,5 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, д. 7А. Назначение: здание неустановленного назначения; наименование: одноэтажное кирпично-панельное здание утепленного навеса для сельхозмашин. Составные части и принадлежности: одноэтажное кирпично-панельное здание утепленного навеса для сельхозмашин. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 321850100001001190 площадью 5,2100 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 209 952,00 бел. рублей, задаток – 20 995,20 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 17.** Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-75203 общей площадью 680,2 кв. м., расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, д. 2. Назначение: здание административно-хозяйственное; наименование: здание административного корпуса. Составные части и принадлежности: двухэтажное кирпичное здание административного корпуса с подвалом (А 2/к). Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623650100001002932 площадью 1,1165 га (право постоянного пользования). В отношении части капитального строения имеются действующие договоры аренды. **Начальная цена продажи – 295 920,00 бел. рублей, задаток – 29 592,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 18.** Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-75196 общей площадью 1 319,0 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, д. 2. Назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции); наименование: здание механической мастерской. Составные части и принадлежности: одноэтажное бетонно-кирпичное здание механической мастерской с пристройкой б), складом-пристройкой а). Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623650100001002932 площадью 1,1165 га (право постоянного пользования). В отношении части капитального строения имеется действующий договор аренды. **Начальная цена продажи – 709 560,00 бел. рублей, задаток – 70 956,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 19.** Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-15482 общей площадью 30,6 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Ольховских, 10-29. Назначение: квартира; наименование: квартира. Начальная цена продажи – 31 770,00 бел. рублей, задаток – 3 177,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Недвижимость»

**Аукцион состоится 23.12.2021 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318, зал для аукционов**

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) с отметкой банка, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318 (отдел по реализации недвижимости и арендных отношений) в рабочие дни: пн.- чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15.
**Окончание приема заявлений – 20.12.2021 в 15.00.**
Задаток перечисляется на расчетный банковский счет Организатора аукциона: р/с BY53 AKBB 3012 0134 7111 1530 0000, БИК AKBBBY2X,
ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ №514, г. Минск, ул.Сурганова, 47а, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633, ОКПО 37411910. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом **23 декабря** 2021 года.
**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным**

**Контакты организатора аукциона: +375 17 378 87 02; +375 44 763 62 63**

# АДНА ПРАСТОРА НА ЎСІХ

*Усё часцей даводзіцца чуць: у кожнага дзіцяці павінна быць асабістая прастора. Часта пад гэтым разумеюць асобны пакой або куток, дзе дзіця можа адасобіцца, заняцца сваімі справамі. Псіхолагі аднагалосна сцвярджаюць: адчуванне ўласнай тэрыторыі дапамагае расці маленькаму чалавеку самастойным і адказным.*

*Не паспеў мой маленькі сынок пайсці ў дзіцячы садок, як да нас у госці напрасілася выхавальніца. Такія цяпер правілы: дзяржаўныя органы павінны ведаць, у якіх умовах выхоўваецца дзіця. Дашкольную ўстанову ў асобе Алены Мікалаеўны цікавіла, дзе спіць малы, ці ёсць у яго асобная зона для гульняў, дзе ён сядзіць, калі малюе або лепіць нешта з пластыліну. У ідэале, вядома, у кожнага сучаснага дзіцяці павінен быць асобны пакой. Але ці змажа сабе такое дазволіць кожная сям'я?*

*У маім дзяцінстве асобны пакой з'явіўся толькі тады, калі старэйшы брат пайшоў у армію. Нягледзячы на тое, што ўмовы дазвалялі (калі мне было два гады, бацькі атрымалі ў вёсцы трохпакаёвую кватэру), да гэтага часу я спала ў пакоі бацькоў. А гуляла, малявала, нешта майстравала, дзе прыйдзецца, — як кажуць, метры дазвалялі. Займець уласны пакой, адкуль яшчэ нядаўна ганяў мяне брат, было найвялікшым шчасцем. Туды перамясціліся ўсе мае цацкі, з якімі ў свае дзевяць гадоў я ўжо практычна не гуляла, братавы паліцы занялі дзіцячыя кнігі, пусты стол хутка «аброс» падручнікамі і сшыткамі — нарэшце, я пачала рабіць урокі не на матуліным стале, дзе час у мяне быў абмежаваны (штовечар яна, настаўніца пачатковых класаў, пісала планы), а на сваім, дзе мае рэчы маглі знаходзіцца столькі, колькі заўгодна.*

*А як было прыемна прымаць ва ўласным пакоі сяброў! Дзверы зачыніш — і нам ніхто не перашкаджае. І бацькам зручна: ніякіх смартфонаў-планшэтаў тады ніхто не ведаў (нават камп'ютар у мяне з'явіўся ўжо ў старэйшых класах), таму гульні-заняткі ў нас былі гучныя. Адным словам, на ўласную прастору ў маім дзяцінстве грэх скардзіцца. Чаго не скажаш пра маіх бацькоў.*

*Маці нарадзілася на хутары. Пад адным дахам невялікай хаты жылі муж з жонкай, іх дзве дачкі, а таксама гаспадары — дзед, яго сястра. Летам жыхароў станавілася больш: на хутар з'язджаліся ўсе гарадскія родзічы са сваімі дзецьмі. Пра асабістую прастору тады, вядома, ніхто не думаў. Адасобіцца ад астатніх і ў цішыні пачытаць тую ж кнігу мая мама магла дзесьці ў садку пад яблыняй.*

*Такой раскошы, у адрозненне ад яе, мой бацька не меў. Не, садок у дзеда Івана таксама быў, і пуня з духмяным сенам, дзе можна было адпачыць або пачытаць. Ды і ў хаце, нягледзячы на адсутнасць уласнага пакою і кута, калі захацелася б, можна было б знайсці месца для ўласных спраў (узяць тую ж печ — залез і адпачывай сабе ў адзіноце). Справа не ў гэтым. Зранку да вечара, асабліва летам, вясковыя дзеці, а тым больш хлопцы, былі заўсёды пры справе, таму нават думкі не ўзнікала ні пра вольны час, ні пра ўласную прастору.*

*Пра якую асабістую прастору магла думаць мая бабуля Тэня, якая жыла разам з бацькамі і яшчэ шасцю братамі ды сёстрамі ў маленечкай хатцы? Калі па некалькі дзяцей спала на адной лаўцы. Калі елі з адной талеркі і пілі з аднаго кубка, перадаючы яго па крузе. Або мой дзед Іван, які з малых гадоў працаваў у пана і туліўся ў нейкай каморцы?*

*Гэта я да чаго? Вельмі разумнымі сёння людзі сталі, да парад псіхолагаў прыслухоўваюцца. Я ні ў якім разе іх не аспрэчваю. Проста хачу сказаць: не было ў нашых продкаў уласных пакояў, кута свайго яны нават часта не мелі, але людзьмі многія з іх сталі. Прычым іх чалавечым якасцям сучасная моладзь, якая з маленства не ведае ніякіх абмежаванняў, можа толькі пазайздросціць.*

*Абсурднай, на мой погляд, сёння выглядае сітуацыя, калі ў двухпакаёвай кватэры адзін з пакояў бацькі аддаюць свайму дзіцяці-падлетку, а ў іншым туляцца разам з меншымі або са сваімі пажылымі бацькамі, якія прыехалі да іх на зімоўку. Недарэчна, па-мойму, і тое, калі маладыя бацькі, начытаўшыся рэкамендацый спецыялістаў, адсяляюць сваё дзіця, якое толькі што нарадзілася, у асобны пакой, а потым бегаюць па дзесяць, а то і больш разоў за ноч па кожным піску немаўляці.*

*Вядома, сітуацыю з уласнай прасторай дзіцяці кожны павінен вырашаць сам. І ў першую чаргу па сваіх магчымасцях. Мяне, шчыра кажучы, гэтае пытанне сёння мала хвалюе. Пакуль падчас дэкрэтнага адпачынку жылі з Цёмікам у маіх бацькоў, спалі з сынам у адным пакоі, гулялі паўсюль. Дагэтуль Арцёмкавы цацкі там ледзь не ва ўсіх кутах. Калі прыехалі ў Мінск, размясціць сына ў асобным пакоі не палічылі патрэбным. І дастаткова гарманічна ў інтэр'ер аднаго з памяшканняў упісваецца і бацькоўская канапа, і дзіцячы ложак, і паліца з рэчамі дарослых, і Цёмаў стол з крэслам, за якім ён часта бавіць час. Пакуль я гатую на кухні, сын любіць садзіцца побач і разглядваць кнігі або маляваць, што мне ніколі не перашкаджае. Яго асабістая прастора — гэта пакуль і частка нашай з яго бацькам прасторы. І разам нам вельмі камфортна.*

**Вераніка КАНЮТА.**


# Сямейная газета

Выпуск № 21 (180)


Тыя, хто побач

Салістка балета Марына ВЕЖНАВЕЦ:

# «Для мяне сям'я немагчымая без кахання»



**Прыхільнікі прымы-балерыны Вялікага тэатра заслужанай артысткі Беларусі Марыны ВЕЖНАВЕЦ пішуць, што іх самыя любімыя спектаклі менавіта тыя, калі яна танцуе ў пары з мужам — уладальнікам такіх жа тытулаў Юрыем КАВАЛЁВЫМ. Так, яны прыгожыя і па-акцёрску пераканаўчыя. Створаныя імі вобразы не пакідаюць публіку абыякавай. Але, як прызналася сямейна-балетная пара, работа — тое, з-за чаго яны могуць паспрачацца.**

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Сітуацыя

# ТРАПІЛІ Ў СЕТКУ...

## Плюсы і мінусы гаджэтаў у жыцці дзіцяці

**Пеця ніколі не вучыўся на «выдатна». Бацькі шмат працавалі, таму кантраляваць дзіця не было каму. Яны сварыліся на сына, але нічога не маглі зрабіць. Па дапамогу да псіхолагаў не звярталіся, спадзяваліся, што «з часам перарасце».**

У старшай школе хлопчык, як лічыла маці, трапіў у дрэнную кампанію і пачаў курыць. Аднак паабяцаў кінуць — з умовай, што яму, нарэшце, купяць камп'ютар. Пеця стрымаў абяцанне, але... пачаў прагульваць школу. Ішоў туды з раніцы, аднак пасля некалькіх урокаў вяртаўся дадому і садзіўся гуляць за камп'ютар.

Бацькам прыходзілася «канваіраваць» сына да школы, яны саромелі яго, пагражалі, умольвалі, клікалі на дапамогу настаўнікаў. Нічога не дапамагала. У пачатку дзявятага класа настаўнікі сказалі, што Пеця экзамены не здасць, і прапанавалі дапаможную школу. На камісію малады чалавек не пайшоў і канчаткова засеў дома, каля камп'ютара...



Такіх людзей, як Пеця, у Японіі называюць «хікікаморы», або «хікі», сама з'ява азначае добраахвотнае пустэльніцтва без усялякай сувязі з навакольным светам. Псіхолагі розных краін занепакоеныя навамоднай тэндэнцыяй, якая прымушае маладых людзей разрываць сувязь з рэальнасцю. Пакаленне «хікі» лічыць за лепшае бавіць час у віртуальнай прасторы сусветнага павуціння.

— Гэта новая тэндэнцыя насцярожвае і прымушае задумацца, — кажа **псіхолаг Мінскага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей Вольга ВАРАНЬКО**. — Мінус гаджэтаў у тым, што яны развіваюць у дзяцей «віртуальны мозг», у якім фарміруюцца скажоныя, далёкія ад рэальнасці вобразы свету. У выніку ўзнікаюць паводзінскія складанасці, якія праяўляюцца, напрыклад, у тым, што дзіця дрэнна прыстасоўваецца да рэальнага свету, у прыватнасці да школьнага асяроддзя, у яго перастаюць працаваць межы ў зносінах з людзьмі і іншае.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

Рабіць дабро

# САГРЭЕМ ДЗІЦЯЧЫЯ СЭРЦЫ!

**Рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці» ўжо больш за чвэрць стагоддзя. Тады, у 1995 годзе, указам Прэзідэнта Беларусі быў зацверджаны Нацыянальны план дзеянняў па паляпшэнні становішча дзяцей і ахове іх правоў на 1995—2000 гады. У ім былі прапісаны дзясяткі важных задач на найбліжэйшую пяцігодку, у тым ліку стварэнне Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення і банка дзяцей-сірот, пашырэнне сеткі рэабілітацыйных цэнтраў. І разам з гэтым — правядзенне перадсвяточных дабрачынных акцый «Нашы дзеці».**

Кожны год напярэдадні навагодніх свят і Каляд кіраўнікі органаў дзяржкіравання, мясцовыя ўлады, бізнесмены, спартсмены, зоркі эстрады і проста неабыякавыя грамадзяне наведваюць дзіцячыя дамы-інтэрнаты, прыёмныя сем'і, бальніцы, каб падарыць дзецям незабыўнае свята. Сёлета традыцыйная рэспубліканская акцыя пройдзе з 14 снежня да 14 студзеня.

«Колькасць тых, хто ўдзельнічае ў акцыі, з году ў год узрастае. У многіх дзяржорганаў, прыватных структур ужо склаліся шэфскія сувязі, якія падтрымліваюцца не толькі ў перыяд акцыі», — адзначыў **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА** перад чарговым пасяджэннем аргкамітэта.

Традыцыйныя мерапрыемствы пройдуць у Мінску: галоўная ёлка краіны, дабрачынныя святы ў Палацы Рэспублікі і Палацы Незалежнасці, баль для навучэнцаў і студэнтаў — пераможцаў рэспубліканскіх конкурсаў і алімпіяд. Паводле слоў Ігара Петрышэнкі, для гэтага каля 4500 дзяцей будуць запрошаны ў сталіцу. Намеснік прэм'ер-міністра падкрэсліў, што ўсё будзе арганізавана ў адпаведнасці з рэкамендацыямі Міністэрства аховы здароўя па правядзенні санітарна-процірэпідэмічных мерапрыемстваў.

У гэтым годзе ўпершыню будзе праведзены дабрачынны збор сродкаў для паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі, аховы здароўя, сацыяльнай абароны.

«Спадзяюся, нашы грамадзяне з задавальненнем адгукнуцца на гэту ініцыятыву і прымуць удзел у зборы грашовых сродкаў», — дадаў віцэ-прэм'ер.

Не толькі ў Мінску, але і ў рэгіёнах краіны вельмі сур'ёзна рыхтуюцца да самай папулярнай у краіне дабрачыннай акцыі. Так, напрыклад, «Беларускі дзіцячы фонд» у Магілёўскай вобласці аб'явіў аб старце 1 снежня дабрачыннага марафону «Сагрэем дзіцячыя сэрцы», які, дарэчы, з'яўляецца складнікам акцыі «Нашы дзеці».

«Галоўная мэта марафону — дапамога дзецям-сіротам, якія знаходзяцца пад апекай, дзецям-інвалідам, хворым, дзецям з малазабяспечаных і шматдзетных сем'яў, якія маюць патрэбу, а таксама прыцягненне ўвагі да праблем гэтай катэгорыі дзяцей, — патлумачыла **дырэктар Магілёўскага абласнога аддзялення РГА «Беларускі дзіцячы фонд» Ірына ФІСЮК**. — Падчас навагодніх і калядных свят для такіх дзетак пройдзе шмат розных мерапрыемстваў. Усе ўдзельнікі атрымаюць навагоднія падарункі. Летась пры падтрымцы гарадской дабрачыннай грамадскай арганізацыі «Благо» падарункі атрымалі амаль 1,5 тысячы дзяцей».

Гарадскі дабрачынны марафон «Падарым дзецям казку» ў Бабруйску таксама прымеркаваны да рэспубліканскай акцыі і стартуе 14 снежня. На працягу ўсяго марафону на мясцовым тэлеканале будуць трансліравацца ролікі, дзе ўдзельнікі дабрачыннага мерапрыемства, кіраўнікі арганізацый, бізнесмены і прадстаўнікі грамадскасці будуць перадаваць падарункі дзецям. Адным з важных атрыбутаў бабруйскага дабрачыннага марафону стане незвычайная навагодняя ёлка. На ёй будуць размешчаны цацкі, у якіх схаваюць пажаданні дзяцей з сацыяльнага прытулку. Кожны госць марафону, апроч тых падарункаў і сертыфікатаў, якія ён прынёс, стане чараўніком для аднаго дзіцяці і выканае яго запаветнае жаданне.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Юрыдычная кансультацыя

# «ЛІПАВЫЯ» РАЗВОДЫ І ШЭРЫЯ ЗАРОБКІ

## Як спагнаць аліменты ад партнёра, калі ён не хоча іх плаціць?

**Каханне скончылася — дзеці засталіся, і гадаваць іх да паўналецця, вядома, лягчэй удваіх, нават калі адзін з бацькоў удзельнічае ў працэсе толькі пасродкам аліментаў. Як атрымаць аліменты, калі былы сужэнец не хоча іх плаціць? Што робяць аліментшчыкі, каб схаваць свой заробак? З якіх даходаў, акрамя зарплаты, можна атрымаць аліменты? Пра гэтыя і іншыя акалічнасці расказалі практыкуючыя адвакаты Мінскай абласной юрыдычнай кансультацыі № 1 Наталля МЕНЧА і Жанна КІСЯЛЁВА.**

### Выплаты са стыпендыі, пенсіі і з-за мяжы

Налічваць аліменты ў Беларусі, згодна з законам, можна з усіх відаў даходаў, у тым ліку са стыпендый, пенсій, дывідэндаў па акцыях. За мяжой, прынамсі, з сацыяльных датацый даўжніка аліменты не ўтрымліваюцца. Таму калі маці-беларуска хоча спагнаць грошы, напрыклад, з бацькі — замежнага пенсіянера, то гэта ёй праз суд зрабіць не ўдасца. Каб атрымаць грашовую дапамогу, калі даход жанчыны нязначны, яна мусіць звярнуцца па прызначэнне ёй пэўных выплат у Беларусі згодна з Законам РБ «Аб дзяржаўных выплатах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей». Аднак пры гэтым за замежным бацькам будуць сачыць: ці не з'явіцца ў яго жаданне падпрацоўваць да пенсіі і атрымаць заробак, з якога грошы ўжо можна будзе спаганяць на карысць малога.



Памер аліментаў, вызначаны законам у Беларусі, складае: на аднаго малога — 25 % ад заробку бацькі, на двух — 33, на трох і больш — 50 %. Пры гэтым для працаздольных бацькоў штомесячны памер аліментаў павінен складаць не менш як 50 % бюджэту пражытачнага мінімуму на аднаго малога, 75 % — на дваіх і 100 % — на траіх і больш малых.

— Тэрмін выплаты аліментаў абмяжоўваецца паўналеццем дзіцяці незалежна ад таго, ці мае яно пасля свайго 18-годдзя даход, вучыцца ці працуе, — удакладніла Жанна Кісялёва. — Калі бацька атрымлівае непастаянны даход або мае даход у натуральнай форме, напрыклад з'яўляецца фермерам, то памер выплат вызначаецца дакладнай сумай — пэўнай колькасцю базавых велічынь.

З іншага боку, ёсць выпадкі, калі памер аліментаў можа быць паменшаны або аліментшчык увогуле будзе вызвалены ад выплат. Напрыклад, калі бацька — інвалід I ці II групы. Або калі аліментшчык мае іншых дзяцей, якія праз выплату аліментаў папярэднім малым аказваюцца ў менш выгадным фінансавым становішчы ў параўнанні з імі. Прымаецца як важлівая прычына да памяншэння памеру аліментаў доўгая хвароба ці страта працаздольнасці.

### Сцэнарый аліментшчыка-ўхіліста

Аліментшчыкі намагаюцца паменшыць выплаты сваім дзецям самымі рознымі спосабамі, прытым настолькі часта, што ў законе гэтае пытанне спецыяльна агаворана.

Сярод найбольш распаўсюджаных варыянтаў, як плаціць менш, — «ліпавы» другі развод. У гэтым выпадку плацельшчык уздымае пытанне аб змяншэнні выплат на дзіця ад першага шлюбу, бо «экс-жонка» другой сям'і таксама падае заяву на аліменты.

— Другая сям'я спыняе сваё існаванне праз суд, бо ў ёй ёсць непаўналетні. Аліменты на першую сям'ю змяншаюцца. Каб адмяніць судовае рашэнне па змяншэнні сумы аліментаў, першай былой жонцы трэба даказаць, што другі развод — фіктыўны, а значыць, няма падстаў памяншаць памеры выплат на дзіця ад першага шлюбу. Тут могуць дапамагчы і сведкі, і фотаздымкі, і нават самі дзеці, якія раскажуць, ці жывуць мама і тата ў адной кватэры. А калі жывуць, ці падзелены ў іх палічкі ў халадзільніку? З усімі сабранымі доказамі першай жонцы трэба ісці ў суд, — параіла адвакат.

Ці не кожная другая скарга на неплацельшчыка-аліментшчыка датычыцца таго, што ён хавае сапраўдную суму свайго заробку. Высветліць, ці так гэта на самай справе, вельмі складана.

— Каб высветліць, ці не атрымлівае плацельшчык зарплату ў канверце або мае іншы від даходу, які нідзе не фігуруе, павінна быць праверка, напрыклад, падатковых органаў або запатрабаванне інфармацыі з пэўных крыніц. Прычым спагнаннік павінен даказаць свае падазрэнні, каб ініцыіраваць падобныя праверкі. Тое ж самае, калі аліментшчык працуе за мяжой. Аднак далёка не заўсёды гэта прыносіць вынік і выводзіць грошы з ценю, — заўважыла адвакат Наталля Менча.

Тлумачэнне «я беспрацоўны!» таксама «не працуе». Парадак спагнання грошай з яго такі ж, як і з працоўнага.

### Аспрэчванне бацькоўства і крымінальная адказнасць

За ўхіленне ад выплаты аліментаў у Беларусі прадугледжана адказнасць, у тым ліку крымінальная. Пры ўзнікненні запазычанасці па аліментах па віне аліментшчыка ён выплачвае спагнанніку няўстойку ў памеры 0,3 % ад сумы няўыплачаных аліментаў за кожны дзень пратэрміноўкі. Такім чынам прадугледжана хоць мінімальнае павышэнне выплат для такіх нядобрасумленных плацельшчыкаў, падкрэсліла Жанна Кісялёва:

— Запазычанасць па аліментах вызначаецца зыходзячы з заробку ці іншага даходу, які атрымаў даўжнік за час, што не рабіў выплаты. І калі неплацельшчык у гэты час сапраўды не працаваў ці не прадставіў дакументы, якія пацвердзілі б яго заробак, памер выплат вызначаецца наступным чынам. На адно дзіця — 50 % бюджэту пражытачнага мінімуму, на двух — 100 %, на трох — 150 %.

Часам праз уласны гонар жанчына сама застаецца без аліментаў, бо проста не падае заяву на іх, як бы цяжка ні даводзілася. На жаль, па законе зрабіць гэта за яе, напрыклад, бабуля дзіцяці не можа, паколькі не з'яўляецца афіцыйным прадстаўніком малога.

**Налічваць аліменты ў Беларусі, згодна з законам, можна з усіх відаў даходаў, у тым ліку са стыпендый, пенсій, дывідэндаў па акцыях.**

Выступаючы супраць аліментаў, таты часам ідуць нават на аспрэчванне бацькоўства. Аднак калі аліменты ўжо спаганяюцца, суд не прыме заяву аб аспрэчванні бацькоўства ад плацельшчыка, пакуль не будзе адменена пастанова аб спагнанні аліментаў. Для гэтага аліментшчык павінен напісаць скаргу, у якой укажа, што ён жадае аспрэчваць бацькоўства, заўважыла Наталля Менча.

### Дамаўляйся, але правярай

Адзін добрасумленны бацька пасля разводу штотыднёва набываў малому ежу і рэчы і захоўваў усе цэтлікі пра гэта. Здаецца, бацькі дамовіліся паміж сабой, і ўсе былі задаволены. Аднак раптоўна былая жонка перадумала і падала заяву на атрыманне аліментаў. І ў гэтым выпадку ніякія чэкі не выратавалі бацьку ад адказнасці па выплаце аліментаў. Таму, перш чым дамаўляцца палюбоўна, трэба высветліць, ці мае такая дамоўленасць юрыдычную моц, каб пасля ніхто не пацярпеў, раяць эксперты.

Увогуле, каб пасля разводу, калі такі здарыцца, не бегаць па судах, лепш загадзя заключаць пагадненне аб дзецях ці шлюбны дагавор, у якім можна прапісаць усе акалічнасці выхавання і ўтрымання малога.

— Каб забяспечыць правы і інтарэсы сваіх непаўналетніх дзяцей, бацькі могуць заключыць пагадненне паміж сабой аб дзецях, калі пытанні адносна іх не вырашаны судовай пастановай, якая ўступіла ў законную сілу, і не ўрэгуляваны шлюбным дагаворам, пагадненнем аб утрыманні сваіх непаўналетніх дзяцей або непрацаздольных паўналетніх дзяцей, якія маюць патрэбу ў дапамозе, — расказала Наталля Менча. — Такім чынам, бацькі могуць заключыць пагадненне нават пасля скасавання шлюбу, а не толькі ў той час, калі яны з'яўляюцца сужэнцамі. Аліменты на непрацаздольных паўналетніх дзяцей, дарэчы, выплачваюцца да канца жыцця або да моманту, калі такое дзіця набывае працаздольнасць.

А вось пагадненнем аб выплаце аліментаў можна прадугледзець аднамомантную грашовую выплату на будучыню або перадачу пэўнай маёмасці замест штомесячных укладанняў у выглядзе аліментаў.

**Ірына СІДАРОК.**

# «Для мяне сям'я немагчымая без кахання»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Вы абодва — выпускнікі Беларускага дзяржаўнага харэаграфічнага каледжа. Ці не ў тых сценах пачаўся ваш раман?***

**Марына Вежнавец:** Не, але я звярнула ўвагу на Юру — вельмі яркі вучань.

**Юрый Кавалёў:** У каледжы Марына была мне не пад густ (*усміхаецца*. — **Аўт.**). А вось у тэатры ўбачыў яе іншымі вачыма ці што... Зараз не разумею, што мне тады было не так.

